МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ
ПРАБЛЕМ КУЛЬТУРЫ

*ЗАЦВЯРДЖАЮ*
*Начальнік Упраўлення*
*навучальных устаноў і кадраў*
*Міністэрства культуры*
*Рэспублікі Беларусь*

# ВУЧЭБНАЯ ПРАКТЫКА:
# П Л Е Н Э Р

ПРАГРАМА
для навучальных устаноў, якія забяспечваюць атрыманне
сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры і мастацтва
па спецыяльнасцях 2-15 01 01 «Жывапіс»,
2-15 01 03 «Скульптура»,
2-15 02 01 «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва»,
2-19 01 01 «Дызайн»

БелДІПК

Мінск • 2004

**Укладальнікі:**

*Гарбунова С. Г.*
*Клепікава С. Б.*
*Лысы І. Э.*
выкладчыкі Мінскага дзяржаўнага мастацкага вучылішча імя А. К. Глебава

**Рэцэнзент**

*Дзягілеў Л. Я.* прафесар кафедры інтэрьера і абсталявання Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў

*Абмеркавана і зацверджана цыклавымі камісіямі малюнку, жывапісу, скульптуры і мастацкай дрэваапрацоўкі Мінскага дзяржаўнага мастацкага вучылішча імя А. К. Глебава (пратаколы № 5 ад 29.04.2003 г., № 10 ад 06.06.2003 г.)*

*Рэкамендавана да выдання рэдакцыйным саветам Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры (пратакол № 7 ад 29.07.2003 г.)*

© Укладанне. Гарбунова С. Г., Клепікава С. Б., Лысы І. Э., 2004
© Арыгінал-макет. БелДІПК, 2004

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Летняя вучэбная практыка з'яўляецца працягам вучэбнай работы па малюнку, жывапісу, кампазіцыі на пленэры, якая вырашае дзве асноўныя задачы:

1) засваенне адметных асаблівасцей работы графічнымі і жывапіснымі сродкамі на адкрытым паветры;

2) назіранне і вывучэнне навакольнага асяроддзя, пранікненне ў глыбіню з'яў жыцця.

Падчас летняй вучэбнай практыкі навучэнцы назапашваюць эцюдны матэрыял для кампазіцыі, таму выбар баз пленэрнай практыкі з'яўляецца адказным момантам у навучальным працэсе.

Летняя вучэбная практыка праводзіцца на працягу трох тыдняў у адпаведнасці з навучальнымі планамі розных аддзяленняў і курсаў.

Працягласць працоўнага дня навучэнца ў час летняй практыкі складае 6 гадзін. Штодзённая нагрузка выкладчыка ў перыяд летняй практыкі — 6 гадзін. Гэта — педагагічныя і кансультацыйныя гадзіны, арганізацыйная і выхаваўчая работа.

Рэжым працоўнага дня ўсталёўваецца выкладчыкам, які кіруе практыкай. Работа на практыцы з жывой мадэллю забяспечваецца натурай згодна навучальнаму плану.

На 1-м курсе летняя практыка праводзіцца без выезду за межы горада: у гарадскіх парках, заапарку, прыродных гаспадарках і г.д. Навучэнцы 2 — 3 курсаў выязжаюць у спецыяльна абраныя для праходжання практыкі месцы. У некаторых выпадках магчыма праходжанне практыкі на вытворчасці, пажадана на адкрытым паветры.

Перад пачаткам практыкі выкладчык павінен правесці з навучэнцамі гутарку аб мэтах і задачах летняй практыкі, аб метадах работы на адкрытым паветры, знаёміць з рэжымам працоўнага дня.

Падчас практыкі навучэнцы выконваюць працяглыя і кароткачасовыя заданні (эцюды і малюнкі) як пад кіраўніцтвам выкладчыка, так і самастойна.

Паслядоўнасць заданняў і колькасць часу, што адводзіцца па праграме для выканання асобных заданняў, могуць быць зменены выкладчыкам ў залежнасці ад ўмоў работы (надвор'я, асаблівасцей працоўнага дня і г.д.), калі змяненні не парушаюць логіку навучання.

Акрамя заданняў, што выконваюцца з натуры, навучэнцам рэкамендуецца рабіць малюнкі і эцюды па памяці і назіранні (самастойная работа).

Заданні па кампазіцыі выконваюцца ў выглядзе эскізаў. Пасля зацвярджэння выкладчыкам тэмы і вырашэння эскіза далейшая праца над ім вядзецца ў спецыяльна адведзены час і перыядычна праглядаецца выкладчыкам. Канчатковы эскіз на залік па летняй практыцы выстаўляецца разам з падрыхтоўчымі эцюдамі і малюнкамі.

У канцы летняй практыкі праводзіцца прагляд усіх работ з іх адзнакай і арганізуецца выніковая выстава з абмеркаваннем. Адзнака па практыцы ўлічваецца разам з адзнакамі па прадметах, якія не выносяцца на экзаменацыйную сэсію. Выкананне аб'ёму праграмы абавязковае для ўсіх навучэнцаў.

У залежнасці ад лакальных умоў прадметная камісія спецыяльнага цыклу можа рабіць мэтазгодную карэкціроўку ў размеркаванні вучэбных гадзін па раздзелах і тэмах заняткаў. Але агульная колькасць гадзін, адведзеная навучальнымі планамі на прадмет, павінна быць захавана. Усе рацыянальныя змены зацвярджаюцца намеснікам дырэктара вучылішча па навучальнай працы. Выкладчык, які вёў практыку, здае ў вучэбную частку справаздачу і ведамасць наведвання з папярэднімі адзнакамі прац навучэнцаў па пленэру.



## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назвы тэм | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| | ***ПЕРШЫ КУРС*** | **108** |
| | *Спецыяльнасць 2-15 01 03 «Скульптура»* | |
| | **Малюнак** | **53** |
| 1. | Накіды і замалёўкі раслінных форм | 18 |
| 2. | Накіды і замалёўкі жывёл і людзей | 12 |
| 3. | Малюнкі краявіду з архітэктурай | 10 |
| 4. | Малюнак гарадскога краявіду | 13 |
| | **Скульптура** | **45** |
| 5. | Лепка з натуры галіны з лісцямі і кветкамі (у рэльефе) | 15 |
| 6. | Лепка з натуры жывёл (круглая скульптура) | 20 |
| 7. | Лепка з натуры фігур людзей і жывёл (у рэльефе) | 10 |
| | **Кампазіцыя** | **10** |
| 8. | Эскіз кампазіцыі на вольную тэму на аснове назіранняў | 10 |
| | *Спецыяльнасці: 2-15 01 01 «Жывапіс», 2-15 02 01 «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», 2-19 01 01 «Дызайн»* | |
| | **Малюнак** | **40** |
| 1. | Замалёўкі раслін | 6 |
| 2. | Замалёўкі асобных галін і ствалоў дрэў | 6 |
| 3. | Замалёўкі асобных дрэў розных парод | 6 |
| 4. | Замалёўкі архітэктурных фрагментаў | 6 |
| 5. | Малюнкі і замалёўкі сучасных пабудоў і помнікаў архітэктуры | 10 |
| 6. | Малюнкі і накіды жывёл і птушак ў статыцы і руху | 6 |

| № п/п | Назвы тэм | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| | **Жывапіс** | **60** |
| 7. | Эцюд нацюрморта на пленэры | 10 |
| 8. | Эцюд галін і ствалоў дрэў | 4 |
| 9. | Эцюды нескладанага краявіду ў розных станах | 10 |
| 10. | Эцюд краявіду з абмежаванай прасторай | 8 |
| 11. | Эцюд нескладанага прасторавага краявіду | 10 |
| 12. | Эцюды архітэктурных фрагментаў | 6 |
| 13. | Шэраг эцюдаў гарадскога краявіду для кампазіцыі | 12 |
| | **Кампазіцыя** | **8** |
| 14. | Кампазіцыйны эскіз гарадскога краявіду на аснове назіранняў | 8 |
| | ***ДРУГІ КУРС*** | **108** |
| | *Спецыяльнасць 2-15 01 01 «Жывапіс»* | |
| | **Малюнак** | **38** |
| 15. | Малюнкі груп дрэў | 6 |
| 16. | Малюнак краявіду з архітэктурай | 10 |
| 17. | Накіды і кароткія малюнкі жывёл і птушак | 4 |
| 18. | Партрэтныя замалёўкі | 10 |
| 19. | Накіды фігуры чалавека ў руху | 8 |
| | **Жывапіс** | **56** |
| 20. | Эцюды галавы на пленэры | 20 |
| 21. | Эцюды фігуры ў краявідзе | 8 |
| 22. | Эцюды прыроды ў розных станах | 9 |
| 23. | Эцюды краявіду з архітэктурай | 10 |
| 24. | Эцюды краявіду са шматпланавай прасторай | 9 |
| | **Кампазіцыя** | **14** |
| 25. | Эскіз на тэмы працы, адпачынку і побыту | 14 |



| № п/п | Назвы тэм | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| | ***ТРЭЦІ КУРС*** | **108** |
| | *Спецыяльнасць 2-15 01 01 «Жывапіс»* | |
| | **Малюнак** | **25** |
| 26. | Накіды і малюнкі чалавека ў руху | 3 |
| 27. | Кароткачасовыя малюнкі груп людзей і жывёл | 3 |
| 28. | Замалёўкі сельскагаспадарчых альбо прамысловых пабудоў | 4 |
| 29. | Партрэтныя замалёўкі | 15 |
| | **Жывапіс** | **67** |
| 30. | Эцюды фігуры (паўфігуры) чалавека на пленэры:<br>а) эцюд паўфігуры ў сілуэтным вырашэнні;<br>б) эцюд паўфігуры у вопратцы насычаных колераў на сонечным асвятленні;<br>в) эцюд фігуры, размешчанай ў ценю дрэў у сонечны дзень і г.д. | 30 |
| 31. | Працяглыя эцюды краявіду | 21 |
| 32. | Эцюды краявіду (з пабудовамі, постацямі людзей альбо жывёл) у розных станах | 16 |
| | **Кампазіцыя** | **16** |
| 33. | Жанравы эскіз з элементамі краявіду | 16 |
| | **Усяго за тры курсы:** | **324 гадзін** |

## ПЕРШЫ КУРС
*(108 гадзін)*

***Спецыяльнасць 2-15 01 03 «Скульптура»***

### Малюнак
*(53 гадзіны)*

**ТЭМА 1. Накіды і замалёўкі раслінных форм** *(18 гадзін)*

Выконваюцца 10—15 кароткатэрміновых накідаў лісця, бутонаў, кветак, а таксама больш працяглыя замалёўкі асобнай галінкі з лісцямі і кветкамі, малюнак ствалоў дрэў (ствол старой івы, дуба, сасны), малюнкі 2—3 разнастайных парод дрэў, выразных па форме і структуры.

Мэта: вывучэнне асаблівасцей кожнай расліны, выяўленне характару, формы і структуры дрэў, перадача вялікай формы, прапорцый, фактуры.

Матэрыял — для накідаў: туш, фламастэры, сангіна; для працяглых малюнкаў — аловак.

Памер — 1/8—1/4 аркуша.

**ТЭМА 2. Накіды і замалёўкі жывёл і людзей** *(12 гадзін)*

Выковаюцца накіды і кароткатэрміновыя малюнкі коней, кароў, коз, сабак, катоў, хатней птушкі і людзей у статыке і руху.

Мэта: развіццё назіральнасці.

Матэрыял — аловак, туш, сангіна.

Памер — 1/8—1/4 аркуша.

**ТЭМА 3. Малюнкі краявіду з архітэктурай** *(10 гадзін)*

Выконваецца некалькі малюнкаў, аб'ектамі у якіх могуць быць пабудовы вясковага і гарадскога тыпу, помнікі архітэктуры.

Мэта: пошук найбольш удалага пункта гледжання, пошук і выяўленне планаў (уменне пабудаваць пейзаж з улікам лінейнай і прасторавай перспектывы).



Матэрыял — мяккі аловак, сангіна, соус, таніраваная папера.

Памер — 1/4—1/2 аркуша.

**ТЭМА 4. Малюнак гарадскога краявіду** *(13 гадзін)*

Выконваецца доўгатэрміновы малюнак гарадскога краявіду, на аснове кароткатэрміновых падрыхтоўчых замалёвак.

Мэта: кампазіцыйная пабудова і пошук найбольш выразнага пункта гледжання. Пабудова лінейнай і прасторавай перспектывы.

Матэрыял — аловак.

Памер —1/2 аркуша.

### Скульптура
*(45 гадзін)*

**ТЭМА 5. Лепка з натуры галіны з лісцямі і кветкамі (у рэльефе)** *(15 гадзін)*

Кожны навучэнец выбірае для работы невялікую галінку з лісцем, кветкамі або пладамі. Напрыклад, галінка дуба з лістамі і жалудамі, галінка каштана з кветкамі г.д. Заданнне выконваецца ў рэльефе.

Матэрыял — пластылін.

Памер даскі — 30х50 см.

**ТЭМА 6. Лепка з натуры жывёл (круглая скульптура)** *(20 гадзін)*

Аб'екты пастаноўкі: конь, карова, каза, сабака і г.д. (жывая натура). Прадугледжваецца выкананне двух эцюдаў (па 7 гадзін кожны і двух—трох карткатэрміновых накідаў).

На пачатку заняткаў выкладчык знаёміць навучэнцаў з падрыхтоўкай каркаса для лепкі жывёл.

Мэта: знаёмства з асаблівасцямі лепкі жывёл, перадача характэрнага руху, а таксама пэўных асаблівасцей выбранай для лепкі жывёлы. Вывучэнне анатамічнай пабудовы жывёлы.

Матэрыял — пластылін.

Памер даскі — 20х30 см.

**ТЭМА 7. Лепка з натуры фігур людзей і жывёл (у рэльефе)** *(10 гадзін)*

Аб'екты: пастаноўкі фігуры апранутых людзей, каня, каровы, сабакі, кошкі.

Мэта: развіццё назіральнасці, набыццё навыкаў выяўлення фігуры ў рэльефе.

Матэрыял — пластылін.

Памер дaскі — 30х40 см.

## Кампазіцыя

*(10 гадзін)*

**ТЭМА 8. Эскіз кампазіцыі на вольную тэму на аснове назіранняў** *(10 гадзін)*

Мэта: выбар пластычнага матыву. Стварэнне выразнага з усіх бакоў эскіза.

Матэрыял — пластылін.

Памер — 20х30 см.

***Спецыяльнасці: 2-15 01 01 «Жывапіс», 2-15 02 01 «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», 2-19 01 01 «Дызайн»***

## Малюнак

*(40 гадзін)*

**ТЭМА 1. Замалёўкі раслін** *(6 гадзін)*

Выконваюцца замалёўкі лісця папараці, лопуху і інш., выявы даюцца ў асяроддзі іншых раслін.

Мэта: вывучэнне асаблівасцей пэўнай расліны; вызначэнне формы, структуры.

Матэрыял — аловак.

Памер — 1/8 аркуша.

**ТЭМА 2. Замалёўкі асобных галін і ствалоў дрэў** *(6 гадзін)*

Выконваюцца два малюнкі:

а) малюнак буйной галіны дрэва з невялікай колькасцю лісця.



Мэта: вывучэнне будовы галіны, яе характар, структура, перадача прасторы.

б) малюнак ствалоў дрэў (ствол старой івы, дубу і інш.).

Мэта: выяўленне формы.

Матэрыял — аловак.

Памер — 1/8 аркуша.

**ТЭМА 3. Замалёўкі асобных дрэў розных парод** *(6 гадзін)*

Выконваюцца два малюнкі. Выбіраюцца дрэвы выразныя па форме і структуры.

Мэта: вызначэнне характару кожнага дрэва, выяўленне асаблівасцей, перадача вялікай формы, прапорцый, структуры і г.д.

Матэрыял — аловак.

Памер — 1/4—1/8 аркуша.

**ТЭМА 4. Замалёўкі архітэктурных фрагментаў** *(6 гадзін)*

Выконваюцца некалькі малюнкаў з выяўленнем элементаў архітэктурных пабудоў.

Мэта: практычнае выкананне элементаў дэкарыравання архітэктурных помнікаў.

Матэрыял — аловак.

Памер — 1/4 аркуша.

**ТЭМА 5. Малюнкі і замалёўкі сучасных пабудоў і помнікаў архітэктуры** *(10 гадзін)*

Выконваецца некалькі малюнкаў з сучаснымі пабудовамі і помнікамі архітэктуры.

Мэта: кампазіцыйнае вырашэнне, перадача перспектывы, вызначэнне прапорцый.

Матэрыял — аловак.

Памер 1/4 аркуша.

**ТЭМА 6. Малюнкі і накіды жывёл і птушак ў статыцы і руху** *(6 гадзін)*

Выконваюцца накіды альбо кароткачасовыя малюнкі. З адной жывёлы ці птушкі выконваецца некалькі накідаў.

Мэта: развіццё назіральнасці.

Матэрыял — аловак, акварэль, туш.

Памер — 1/8 аркуша.

## Жывапіс

*(60 гадзін)*

**ТЭМА 7. Эцюд нацюрморта на пленэры** *(10 гадзін)*

Выконваецца пастаноўка за 2—3 сеансы. Нацюрморт ставіцца з прадметаў побыту на адкрытым паветры на стале альбо на траве. Праца над нацюрмортам вядзецца аналагічна семестравым пастаноўкам, але з улікам паветранага асяроддзя, узмацнення колеравых рэфлексаў.

Мэта: арганізацыя жывапіснага асяроддзя, перадача паветранай перспектывы, асвятлення.

Матэрыял — акварэльныя, ці іншыя клеявыя фарбы.

Памер вызначае выкладчык.

**ТЭМА 8. Эцюд галін і ствалоў дрэў** *(4 гадзіны)*

Праводзіцца практычнае вывучанне дэталей краявіду — падрыхтоўка да працы над працяглымі эцюдамі.

Мэта: перадача характару дрэва, асаблівасцей будовы, асноўных колеравых адносін, сувязі з асяроддзем.

Матэрыял — акварэльныя, ці іншыя клеявыя фарбы.

Памер вызначае выкладчык.

**ТЭМА 9. Эцюды нескладанага краявіду ў розных станах** *(10 гадзін)*

Выконваюцца 3—4 эцюды (на працягу практыкі) з адной кропкі ў розныя перыяды дня і розных станах: на золку, у прыцёмках, у сонечны і пахмурны дзень і г.д.

Краявід выбіраецца з неглыбокай прасторай.

Мэта: перадача асноўных колеравых адносін — зямлі да неба, дальняга плана да бліжэйшага і г.д.

Матэрыял — акварэльныя, ці іншыя клеявыя фарбы.

Памер вызначае выкладчык.

**ТЭМА 10. Эцюд краявіду з абмежаванай прасторай** *(8 гадзін)*

Выконваецца эцюд за 2—3 сеансы. Для эцюду выбіраецца куточак гарадскога парку, частка дрэва, абмежаваная пабудовамі ці тынам. Працяглы эцюд рэкамендуецца пісаць у пахмурны дзень, калі асвятленне мяняецца нязначна.

Мэта першага сеанса — кампазіцыйнае вырашэнне краявіду, выбар пункта гледжання, вызначэнне асноўных колеравых адносін, вырашэнне буйных аб'ёмаў. Мэта другога сеанса — удакладненне асноўных адносін, праработка дэталей.

Матэрыял — акварэльныя, ці іншыя клеявыя фарбы.

Памер вызначае выкладчык.

**ТЭМА 11. Эцюд нескладанага прасторавага краявіду** *(10 гадзін)*

Выконваюцца тры эцюды. Аб'екты для работы: алея, двор, вуліца.

Мэта: вызначэнне колеравых адносін двух планаў — пярэдняга і дальняга, перадача паветранай перспектывы.

Матэрыял — клеявыя ці алейныя фарбы.

Памер — 1/2 аркуша.

**ТЭМА 12. Эцюды архітэктурных фрагментаў** *(6 гадзін)*

Выконваюцца два эцюды архітэктурных фрагментаў з актыўнай паліхромнай характарыстыкай. Эцюды пажадана пісаць з помнікаў архітэктуры з ужываннем разнастайных матэрыялаў і фактур.

Мэта: выхаванне культуры колеру, азнаямленне з адметнасцямі нацыянальнага мастацтва.

Матэрыял — акварэльныя, ці іншыя клеявыя фарбы.

Памер — 1/2 аркуша.

**ТЭМА 13. Шэраг эцюдаў гарадскога краявіду для кампазіцыі** *(12 гадзін)*

Выконваецца шэраг эцюдаў. Аб'ект для работы: гарадскія вуліцы, двары, індустрыяльныя пабудовы і інш.

Мэта: выхаванне назіральнасці, пошук розных кампазіцыйных вырашэнняў, перадача планавасці, асаблівасцей асвятлення.

Матэрыял — клеявыя ці алейныя фарбы.

Памер — 1/4—1/2 аркуша.

## Кампазіцыя

*(8 гадзін)*

**ТЭМА 14. Кампазіцыйны эскіз гарадскога краявіду на аснове назіранняў** *(8 гадзін)*

Выконваецца кампазіцыйны эскіз гарадскога краявіду на адну з тэм: «Стары горад», «Раніца», «Дождж у горадзе» і г.д.

Мэта: выхаванне назіральнасці, развіццё навыкаў перапрацоўкі падрыхтоўчага натурнага матэрыялу для вырашэння кампазіцыйных праблем, улік пэўнага стану прыроды, часу дня.

Матэрыял — акварэльныя, ці іншыя клеявыя фарбы.

Памер — 1/2 аркуша.

# ДРУГІ КУРС

*(108 гадзін)*

***Спецыяльнасць 2-15 01 01 «Жывапіс»***

## Малюнак

*(38 гадзін)*

**ТЭМА 15. Малюнкі груп дрэў** *(6 гадзін)*

Малююцца дрэвы, якія стаяць групамі на адкрытым месцы.

Мэта: абагульненне дэталей (асобных) дрэў, знаходжанне вялікай масы і разам з тым захаванне асаблівасцей кожнага дрэва.

Матэрыял — аловак, пяро, туш.

Памер — 1/4 аркуша.

**ТЭМА 16. Малюнак краявіду з архітэктурай** *(10 гадзін)*

Выконваюцца два малюнкі за два сеансы:

а) кароткачасовы малюнак краявіду з архітэктурай (2 гадзіны);

б) доўгатэрміновы малюнак краявіду з архітэктурай (6 гадзін).



Асноўнымі кампанентамі такога малюнку з'яўляюцца пабудовы вясковага і гарадскога тыпу, помнікі архітэктуры.

Мэта: знаходжанне найбольш удалага пункта гледжання, пошук і выяўленне планаў, уменне пабудаваць краявід з улікам лінейнай і паветранай перспектывы.

Матэрыял — адвольны.

Памер — 1/4—1/2 аркуша.

**ТЭМА 17. Накіды і кароткачасовыя малюнкі жывёл і птушак** *(4 гадзіны)*

Накіды выконваюцца на працягу ўсёй практыкі (ад 5 да 15 хвілін кожны).

Мэта: развіццё навыку хуткага фіксавання ўбачанага.

Матэрыял — мяккі аловак, сангіна, соус, акварэль, таніраваная папера.

Памер — 1/4 аркуша (на адным аркушы могуць выконвацца некалькі малюнкаў).

**ТЭМА 18. Партрэтныя замалёўкі** *(10 гадзін)*

Выконваюцца кароткачасовыя партрэтныя замалёўкі (1—2 гадзіны кожны). Заданне з'яўляецца працягам семестравых пастановак па тэме «Галава».

Мэта: пошук характару чалавека з улікам ведання анатоміі галавы, яе пабудовы.

Матэрыял — аловак, вугаль, сангіна, пяро, туш.

Памер — 1/4 аркуша.

**ТЭМА 19. Накіды фігуры чалавека ў руху** *(8 гадзін)*

Накіды выконваюцца на працягу ўсёй практыкі (ад 3 да 15 хвілін кожны).

Спачатку выконваюцца накіды фігуры чалавека ў нескладаным, рытмічным руху, затым — у больш складаным ракурсе. Пажадана ў шэрагу накідаў прасачыць ход руху ад пачатку да канца. Карысна выконваць некаторыя накіды па памяці.

Мэта: маляваць фігуры ў руху, перадаваць сувязь іх з навакольным асяроддзем.

Матэрыял — аловак, туш, папера.

Памер вызначае выкладчык.

## Жывапіс
*(56 гадзін)*

**ТЭМА 20. Эцюды галавы на плэнеры** *(20 гадзін)*

Выканаць пяць эцюдаў.

Прыкладныя пастаноўкі:

а) эцюд галавы ў пахмурны дзень на фоне сцяны;

б) эцюд галавы на сонцы на фоне сцяны;

в) эцюд галавы з плечавым поясам ў светлай вопратцы на фоне зеляніны;

г) эцюд галавы з плечавым поясам ў яркай вопратцы;

д) эцюд галавы з плечавым поясам у ценю, пад дрэвам.

Мэта: перадача ўздзеяння на натуру навакольнага асяроддзя, узмацненне колеравых кантрастаў цёплых і халодных тонаў, растушоўванне контураў прадметаў у светлым паветраным асяроддзі, анатамічная пабудова галавы.

Матэрыял — тэмперная, алейная фарбы, палатно, кардон.

Памер — 40х50 (50х60).

**ТЭМА 21. Эцюды фігуры ў краявідзе** *(8 гадзін)*

Самастойна выканаць некалькі эцюдаў фігуры ў краявідзе (па 2—2,5 гадзіны).

Мэта: збор матэрыялу, неабходнага для працы над кампазіцыяй.

Матэрыял — алейныя, клеявыя фарбы.

Памер вызначае выкладчык.

**ТЭМА 22. Эцюды прыроды ў розных станах** *(9 гадзін)*

Выконваюцца 3—4 кароткачасовыя эцюды аднаго аб'екта ў розных станах.

Мэта: перадача рознага стану прыроды (раніца, дзень, вечар, пахмурна, дождж, перад навальніцай і г.д.), прасачыць, як змяняецца лакальны колер на аб'ектах у розных станах.

Матэрыял — алейная, клеявыя фарбы.

Памер вызначае выкладчык.



**ТЭМА 23. Эцюды краявіду з архітэктурай** *(10 гадзін)*

Выконваюцца аднасеансавыя эцюды на працягу ўсёй практыкі, як пад кіраўніцтвам выкладчыка, так і самастойна.

Мэта: самастойны выбар найбольш выгоднай кропкі гледжання для кампазіцыі краявіду, вызначэнне каларыту, стану прыроды і г.д.

Матэрыял — алейныя, клеявыя фарбы.

Памер вызначае выкладчык.

**ТЭМА 24. Эцюд краявіду са шматпланавай прасторай** *(9 гадзін)*

Выконваюцца два эцюды краявіду ў 2—3 сеансы: адзін кароткачасовы, другі працяглы.

Пераход ад напісання эцюдаў з неглыбокай прасторай да шматпланавых краявідаў.

Мэта: выканаць краявіды з высокай з нізкай лініяй гарызонту, з пэўным падзелам на планы, выяўленне паветрай перспектывы ў жывапісе.

Матэрыял — алейныя фарбы.

Памер вызначае выкладчык.

## Кампазіцыя
*(14 гадзін)*

**ТЭМА 25. Эскіз на тэмы працы, адпачынку і побыту** *(14 гадзін)*

Выконваецца тэматычны краявід з фігурамі людзей альбо жывёлы ў руху. Кампазіцыя выконваецца на аснове назіранняў, замалёвак і эцюдаў.

Мэта: выканаць тэматычную кампазіцыю з фігурамі людзей і жывёл.

Матэрыял — алейныя, клеявыя фарбы.

Памер вызначае выкладчык.

## ТРЭЦІ КУРС

***Спецыяльнасць 2-15 01 01 «Жывапіс»***

### Малюнак
*(25 гадзін)*

**ТЭМА 26. Накіды і замалёўкі чалавека ў руху** *(3 гадзіны)*

Выконваюцца на працягу ўсёй практыкі. Накіды і замалёўкі з'яўляюцца багатым матэрыялам для стварэння кампазіцыі.

Мэта: абагуленае выяўленне фігуры ў руху, перадача сувязі фігуры з асяроддзем.

Матэрыял — аловак, туш.

Памер вызначае выкладчык.

**ТЭМА 27. Кароткачасовыя малюнкі груп людзей і жывёл** *(3 гадзіны)*

Выконваецца шэраг малюнкаў груп людзей і жывёл.

Мэта: перадача адзінства і сувязі паміж асобнымі часткамі і ўсёй групай.

Матэрыял — аловак, туш.

Памер 1/8 аркуша.

**ТЭМА 28. Замалёўкі сельскагаспадарчых альбо прамысловых пабудоў** *(4 гадзіны)*

Выконваецца некалькі кароткачасовых замалёвак сельскагаспадарчых альбо прамысловых пабудоў.

Мэта: разбор дэталей, збор матэрыялу для кампазіцыі.

Матэрыял — аловак, туш.

Памер вызначае выкладчык.

**ТЭМА 29. Партрэтныя замалёўкі** *(15 гадзін)*

Выконваецца шэраг кароткачасовых партрэтных замалёвак. Для мадэлі варта выбіраць каларытныя вобразы.

Мэта: развіццё вострага бачання натуры, умення малымі сродкамі перадаць характар мадэлі; знаёмства з рознымі выяўленчымі тэхнікамі (графічнымі і жывапіснымі).

Матэрыял адвольны.

Памер — 1/2—1/4 аркуша.



### Жывапіс
*(67 гадзін)*

**ТЭМА 30. Эцюды фігуры (паўфігуры) чалавека на пленэры** *(30 гадзін)*

Выконваюцца тры эцюды:

а) эцюд фігуры (паўфігуры) ў сілуэтным вырашэнні;

б) эцюд фігуры (паўфігуры) ў вопратцы насычаных колераў на сонечным асвятленні;

в) эцюд фігуры (паўфігуры), размешчанай у цяню дрэў у сонечны дзень.

Пажадана, каб мадэлямі пастановак былі не натуршчыкі, якія пазіруюць спецыяльна, а пэўныя людзі за натуральным заняткам.

Мэта: перадача жывапіснага асяроддзя (павелічэнне колеравых кантрастаў цёплых і халодных тонаў, праца над контурам і дотыкам ў светлапаветраным асяроддзі і інш.), правільная анатамічная пабудова фігуры, перадача характару мадэлі і г.д.

Матэрыял — клеявыя, алейныя фарбы.

Памер — не больш за 1 метр па большым баку.

**ТЭМА 31. Працяглыя эцюды краявіду** *(21 гадзіна)*

Выконваюцца тры эцюды краявіду ў некалькі сеансаў (з глыбокай, неглыбокай і бясконцай прасторай).

Мэта: вырашэнне прасторы сродкамі жывапісу; прасачыць, як змяняецца кампазіцыйная пабудова краявіду з пэўнай прасторай, як змяняецца каларыт, тон і г.д.; свядомы падыход да выбару матыву, выкананне падрыхтоўчых малюнкаў, удасканаленне навыкаў працы алейнымі фарбамі.

Матэрыял — алейныя фарбы.

Памер вызначае выкладчык.

**ТЭМА 32. Эцюды краявіду (з пабудовамі, постацямі людзей альбо жывёл) у розных станах** *(16 гадзін)*

Выконваецца шэраг эцюдаў з пабудовамі, постацямі людзей альбо жывёл ў розным стане прыроды (пажадана аднаго матыву). Эцюды з'яўляюцца багатым натурным матэрыялам для кампазіцыі.

Мэта: удасканаленне работы над краявідам, перадача рознага стану прыроды.

Збор матэрыялу для кампазіцыі.

Матэрыял — алейныя фарбы.

Памер вызначае выкладчык.

### Кампазіцыя
*(16 гадзін)*

**ТЭМА 33. Жанравы эскіз з элементамі краявіду** *(16 гадзін)*

Выконваецца жанравы эскіз кампазіцыі з элементамі краявіду. Кампазіцыя выконваецца на аснове назіранняў, замалёвак і эцюдаў.

Мэта: выкананне жанравай кампазіцыі з фігурамі людзей і жывёлы.

Матэрыял — алейныя, клеявыя фарбы.

Памер вызначае выкладчык.

### Літаратура

*Базанова М. Д.* Пленэр. Учебная практика в художественном училище: Учеб. пособие. М., 1994.

*Ватагин В. А.* Изображение животного. М., 1957.

*Дейнека А.* Учитесь рисовать. М., 1961.

*Кузин В. С.* Наброски и зарисовки: Пособие для учителей: 2-е изд., перераб. М., 1981.

*Лантери Э.* Лепка. М., 1963.

*Маслов Н. Я.* Пленэр: Практика по изобразит. искусству: Учеб. пособие для студ. худож.-граф. фак. пед. ин-тов. М., 1984.

*Претте М., Капльдо А.* Творчество и выражение. М., 1981, 1985.

*Тихонова В.* Скульпторы-анималисты Москвы. М., 1969.

*Фаврский В.* Литературно-теоретическое наследие. М., 1988.

*Вучэбнае выданне*

ВУЧЭБНАЯ ПРАКТЫКА: ПЛЕНЭР

ПРАГРАМА
для навучальных устаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры і мастацтва па спецыяльнасцях
2-15 01 01 «Жывапіс»,
2-15 01 03 «Скульптура»,
2-15 02 01 «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва»,
2-19 01 01 «Дызайн»

Укладальнікі:
*Гарбунова Святлана Георгіеўна,*
*Клепікава Святлана Барысаўна,*
*Лысы Іосіф Эдуардавіч*

Адказны за выпуск *Н. В. Смоляк*

Рэдактар *В. К. Жолтак*
Макет і вёрстка *Ю. В. Шабан*
Дызайн *І. М. Рэзнікава*

Арыгінал-макет падрыхтаваны
на настольна-выдавецкай сістэме БелДІПК

Падпісана да друку 10.03.2004. Фармат 60x84 $^{1/16}$.
Папера афсетная. Афсетны друк.
Ул.-выд. арк. 1,0. Ум. друк. арк. 1,15. Тыраж 100 экз.
Зак.

Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры.
ЛВ № 163 ад 28.01.2003 г.
220086, г. Мінск, вул. Каліноўскага, 12.

Друкарня «Транстэкс».
ЛП № 374 ад 08.12.1999 г.
220034, г. Мінск, вул. Чапаева, 5.

ПРАГРАМА

# ВУЧЭБНАЯ ПРАКТЫКА: ПЛЕНЭР

МІНСК 2004